**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па гуманітарнай адукацыі

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_______________ **В.А. Богуш**
03.05.2016
(дата зацвярджэння)

Рэгістрацыйны № ТД-Д.371/тып.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці: 1-21 03 01 Гісторыя (па напрамках)

**УЗГОДНЕНА**
Старшыня Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі
_______________ **А.В. Данільчанка**
22. ___
(дата)

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Управлення вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
_______________ **С.І. Раманюк**
03.05.2016
(дата)

**УЗГОДНЕНА**
Прарэктар па навукова-метадычнай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»
_______________ **І.У.Цітовіч**
25. ___
(дата)

Эксперт-нормакантралёр
_______________
13.04.2016
(дата)

Мінск 2016

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

**А. Г. Каханоўскі,** загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, дацэнт;
**Ю. Л. Казакоў,** загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
**П. І. Зялінскі,** прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар;
**В. С. Макарэвіч,** дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
**Г. І. Маскевіч**, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
**У.А. Падалінскі,** дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
**В. А. Цяплова,** дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
**А. В. Бурачонак,** дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Кафедра эканамічнай гісторыі Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» (загадчык кафедры **Ю.М. Бохан,** доктар гістарычных навук, прафесар);

**М.М. Забаўскі,** прафесар кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар гістарычных навук, прафесар.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 12 ад 16 мая 2015 г );

Кафедрай гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 15 ад 30 красавіка 2015 г.);

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 1 ад 23 верасня 2015 г.);

Навукова-метадычным саветам па гуманітарных навуках Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі
(пратакол № 3 ад 22 верасня 2015 г.)

**Адказны за рэдакцыю:** *А. Г. Каханоўскі*
**Адказны за выпуск:** *Ю. Л. Казакоў*

# ЗМЕСТ

1. Тлумачальная запіска…………………………………………………… 4
2. Прыкладны тэматычны план…………………………………………… 9
3. Змест вучэбнага матэрыялу…………………………………………… 11
4. Інфармацыйна-метадычная частка…………………………………… 42

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па дысцыпліне «Гісторыя Беларусі» прызначана для засваення на першай ступені вышэйшай адукацыі студэнтамі, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1–21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)». У ёй абноўлены змест, зроблены акцэнт на кампетэнтасны падыход, пашыраны патрабаванні да самастойнай работы студэнтаў, прадугледжана выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій.

Вучэбная праграма дысцыпліны «Гісторыя Беларусі» распрацавана ў адпаведнасці з наступнымі нарматыўнымі і метадычнымі дакументамі:

– «Адукацыйны стандарт вышэйшая адукацыі. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1–21 03 01 Гісторыя (па напрамках)». Зацверджаны і ўведзены ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 30.08. 2013 № 88;

– «Парадак распрацоўкі і зацвярджэння вучэбных праграм і праграм практыкі для рэалізацыі зместа адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі» (зацверджаны Міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь 06.04.2015);

– Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 29.05.2012 № 53 «Аб зацвярджэнні правіл правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі»;

– Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 01.09.2011 № 251 «Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку ажыццяўлення эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў сферы адукацыі»;

– Рэкамендацыі па рэалізацыі Канцэпцыі аптымізацыі зместу, структуры і аб'ёму сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі (зацверджаны Міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22.05.2014 г.).

У вучэбнай праграме ўлічаны патрабаванні адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1–21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)»да кампетэнтнасці спецыяліста.

У адпаведнасці з патрабаваннямі да *акадэмічных кампетэнцый* спецыяліст павінен:

– умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач;

– валодаць сістэмным і параўнаўчым аналізам;

– валодаць даследчыцкімі навыкамі;

– умець працаваць самастойна;

– быць здольным выпрацоўваць новыя ідэі (крэатыўнасць);

– валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем;

– валодаць навыкамі, звязанымі з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў, кіраваннем інфармацыяй і працай з камп'ютарам;

– валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі;
– умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу жыцця.

У адпаведнасці з патрабаваннямі да *сацыяльна-асобасных кампетэнцый* спецыяліст павінен:

– валодаць якасцямі грамадзянскасці;
– быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;
– валодаць здольнасцю да міжасабовых камунікацый;
– валодаць навыкамі здаровага ладу жыцця;
– быць здольным да крытыкі і самакрытыкі (крытычнае мысленне);
– умець працаваць у камандзе;
– быць здольным да самастойнага навучання;
– умець фарміраваць асабістыя высновы;
– быць здольным прымяняць атрыманыя веды.

У адпаведнасці з патрабаваннямі да *прафесійных кампетэнцый* спецыяліст павінен:

– планаваць, арганізоўваць і весці вучэбна-метадычную і навукова-метадычную работу;
– абагульняць і распаўсюджаваць перадавы вопыт арганізацыі выхаваўчай работы;
– фарміраваць грамадзянскую пазіцыю, патрыятызм, развіваць эстэтычныя прадстаўленні і высокія маральныя якасці асобы;
– выкарыстоўваць неабходныя метады даследавання, мадыфіцыраваць існуючыя і ствараць новыя метады даследавання, зыходзячы з дакладных задач;
– планаваць, арганізоўваць і ўдасканальваць работу ў працоўных калектывах;
– дыялектычна мысліць і аргументаваць свой пункт гледжання, аналізаваць факты і рабіць прагнозы развіцця падзей;
– аналізаваць гістарычныя і сучасныя праблемы эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага і культурнага жыцця грамадства, тэндэнцыі яго ўстойлівага развіцця.
– мець веды, практычны вопыт для кансультавання ў пытаннях вывучэння гісторыі, арганізацыі даследчыцкіх работ і выхаваўчага працэсу ва ўстановах адукацыі, навукі і культуры;
– ацэньваць канкурэнтназдольнасць і эканамічную эфектыўнасць тэхналогій, якія распрацоўваюцца.

***Мэта*** вывучэння дысцыпліны «Гісторыя Беларусі» заключаецца ў набыцці студэнтамі ведаў аб асноўных этапах, з'явах, падзеях і імёнах айчыннай гісторыі; разуменні яе месца ў сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў; у дакладным уяўленні імі ўзаемапранікненняў і ўзаемаўплываў народаў, што адбываліся на сумежжы цывілізацый Захаду і Усходу; у фарміраванні

творчай і гарманічнай, з навукова-гуманістычным светапоглядам, сацыяльна завостранай асобы.

Для рэалізацыі вызначаных мэт прадугледжваецца вырашэнне наступных ***задач***:

– навучыць студэнтаў знаходзіць прычынна-выніковыя сувязі гістарычных працэсаў і падзей;

– прывіць ім навыкі ў вызначэнні фактараў, якія абумовілі змест, характар і асаблівасці рэгіянальнага развіцця;

– сфарміраваць крытычны падыход да аналізу мінулага і правядзення яго сувязі з сучаснасцю;

– садзейнічаць фарміраванню ў выпускніка вышэйшай школы актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

«Гісторыя Беларусі» мае сувязь з дысцыплінамі «Гісторыя Расіі і Украіны», «Гісторыя першабытнага грамадства», «Гісторыя старажытнага часу», «Гісторыя сярэдніх вякоў», «Гісторыя новага часу», «Гісторыя навейшага часу», «Гісторыя паўднёвых і заходніх славян». Месца вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі» ў сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў вызначаецца прадметам яе вывучэння, якім з'яўляюцца агульнасістэмныя заканамернасці і рэгіянальныя асаблівасці працэсаў дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага і духоўнага развіцця беларускага народа ў кантэксце агульнаеўрапейскай гісторыі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць***:

– асноўныя тэорыі грамадскага развіцця ў адпаведнасці з фармацыйным і цывілізацыйным падыходамі да разгляду гісторыі Беларусі;

– асноўныя этапы фарміравання беларускага этнасу ў розныя гістарычныя перыяды;

– сутнасныя характарыстыкі еўрапейскага, расійскага, савецкага і сучаснага шляхоў мадэрнізацыі ў сацыяльна-эканамічнай, ідэйна-палітычнай, культурнай і духоўнай сферах;

– асноўныя дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры, культурна-гістарычную спадчыну беларускага народа;

– асноўныя этапы станаўлення дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, беларускай дзяржаўнасці і дзяржаўнага суверэнітэта Рэспублікі Беларусь;

– месца і ролю беларускіх зямель у геапалітычных працэсах у розныя гістарычныя перыяды, месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь у працэсах інтэграцыі і глабалізацыі;

***умець***:

– прымяняць фармацыйны і цывілізацыйны падыходы пры характарыстыцы заканамернасцей і асаблівасцей гістарычнага развіцця беларускага соцыума;

– тлумачыць уплыў розных культурна-цывілізацыйных фактараў на сацыяльна-эканамічнае, дзяржаўна-палітычнае, этнаканфесійнае і культурнае развіццё Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды;

– ажыццяўляць параўнальны аналіз рэформ і рэвалюцый у працэсе мадэрнізацыі беларускага грамадства, ацэньваць вынікі дзейнасці савецкай грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сістэмы ў БССР, вызначаць сутнасныя характарыстыкі сучаснай беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця;

– ацэньваць асноўныя дасягненні матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі ў кантэксце гістарычнага развіцця і выкарыстоўваць культурна-гістарычную спадчыну ў сваёй прафесійнай дзейнасці;

– аналізаваць працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці, афармлення і ўмацавання суверэнітэта Рэспублікі Беларусь у аспекце фарміравання прававой дзяржавы;

– характарызаваць ролю і месца беларускіх зямель у рэгіянальным, цывілізацыйным і геапалітычным развіцці ў розныя гістарычныя перыяды, месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь у сучаснай геапалітычнай сітуацыі ва ўмовах інтэграцыі і глабалізацыі;

***валодаць***:

– навуковай метадалогіяй, асноўнымі падыходамі і прынцыпамі ў вывучэнні гістарычнай літаратуры;

– фармацыйным і цывілізацыйным падыходамі пры характарыстыцы заканамернасцей і асаблівасцей гістарычнага развіцця беларускага соцыума;

– навыкамі і методыкай у вывучэнні і выкладанні гісторыі;

– здольнасцямі самастойнага аналізу гістарычных падзей і іх выкарыстання ў працэсе выкладання.

Структура праграмы грунтуецца на вызначэнні і адборы галоўных паняццяў, ідэй, тэндэнцый, фактаў, дат, імён і іншых элементаў гістарычных ведаў, накіравана на тое, каб раскрыць сутнасныя элементы развіцця эканамічных адносін і важнейшыя рысы ў Беларусі; дэмаграфічную характарыстыку і сацыяльную стратыфікацыю грамадства; асноўныя палітычныя падзеі і іх уплыў на дзяржаўна-прававую эвалюцыю Беларусі; канфесійнае і этнакультурнае развіццё; найкаштоўнейшыя здабыткі духоўнага жыцця народа. У структуры зместу вучэбнай дысцыпліны вылучаюцца ўзбуйненыя дыдактычныя адзінкі (раздзелы). Па кожным вучэбным раздзеле ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі па фарміраванню і развіццю ў студэнтаў

прафесіянальных кампетэнцый выкладчыкам (кафедрай) праектуюцца і рэалізуюцца пэўныя лекцыйныя і семінарскія заняткі. Змест вучэбнай праграмы па гісторыі Беларусі дазваляе вывучаць дысцыпліну па праблемнаму і храналагічнаму прынцыпах.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі» адводзіцца 526 гадзін, з якіх аўдыторныя заняткі складаюць 334 гадзіны (200 – лекцый і 134 – семінарскіх заняткаў). Рэкамендуемымі формамі бягучай атэстацыі могуць з'яўляцца экзамены і залікі.

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва раздзелаў і тэм | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | усяго аўдытор ных | З іх | |
| | | | Лекцыі | Семіна ры |
| **1.** | **Раздзел I. Беларускія землі са старажытнасці да канца XIV ст.** | **36** | **20** | **16** |
| 1.1. | Тэма 1. Уводзіны ў гісторыю Беларусі. Першабытная эпоха на тэрыторыі Беларусі (100 – 35 тыс. гг. да н.э. – VIII ст. н.э.) | 12 | 6 | 6 |
| 1.2 | Тэма 2. Раннефеадальныя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях (IX – першая палова XIII ст.) | 12 | 8 | 4 |
| 1.3 | Тэма 3. Утварэнне і станаўленне Вялікага Княства Літоўскага (другая палова XIII–XIV ст.) | 12 | 6 | 6 |
| **2.** | **Раздзел II. Беларусь у канцы XIV–XVI ст.** | **68** | **42** | **26** |
| 2.1 | Тэма 4. Умацаванне Вялікага Княства Літоўскага (канец XIV–XV ст.) | 32 | 18 | 14 |
| 2.2 | Тэма 5. Беларусь у XVI ст. | 36 | 24 | 12 |
| **3.** | **Раздзел III. Беларусь у XVII–XVIII стст.** | **54** | **32** | **22** |
| 3.1 | Тэма 6. Беларусь у XVII – першай палове XVIII ст. | 14 | 8 | 6 |
| 3.2 | Тэма 7. Беларусь у другой палове XVIII ст | 40 | 24 | 16 |
| **4.** | **Раздзел IV. Беларусь у XIX ст.** | **54** | **32** | **22** |
| 4.1. | Тэма 8. Беларусь у першай палове XIX ст. | 24 | 14 | 10 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 4.2. | Тэма 9. Беларусь у другой палове XIX ст. | 30 | 18 | 12 |
| **5.** | **Раздзел V. Беларусь у 1900–1939 гг.** | **70** | **44** | **26** |
| 5.1. | Тэма 10. Беларусь у пачатку XX ст. | 22 | 14 | 8 |
| 5.2. | Тэма 11. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1914–1920) | 26 | 14 | 12 |
| 5.3. | Тэма 12. Беларуская ССР у 20–30-я гг. XX ст. | 16 | 12 | 4 |
| 5.4. | Тэма 13. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы (1921–1939) | 6 | 4 | 2 |
| **6.** | **Раздзел VI. Беларусь з 1939 г. да пачатку XXI ст.** | **52** | **30** | **22** |
| 6.1. | Тэма 14. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны (1939–1945) і Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945) | 16 | 10 | 6 |
| 6.2. | Тэма 15. Беларусь у пасляваенны перыяд (другая палова 40-х – першая палова 50-х гг. XX ст.) | 8 | 4 | 4 |
| 6.3. | Тэма 16. Беларусь у перыяд спроб рэформаў і крызісу адміністрацыйна-каманднай сістэмы (сярэдзіна 50-х – 80-я гг. XX ст.) | 12 | 8 | 4 |
| 6.4. | Тэма 17. Беларусь на сучасным этапе развіцця | 16 | 8 | 8 |
| | **Усяго па дысцыпліне** | **334** | **200** | **134** |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ І. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ СА СТАРАЖЫТНАСЦІ ДА КАНЦА XIV СТ.

### Тэма 1. Уводзіны ў гісторыю Беларусі. Першабытная эпоха на тэрыторыі Беларусі (100–35 тыс. гг. да н. э. – VIII ст. н. э.)

Гісторыя Беларусі як навучальная дысцыпліна. Змест і структура курса. Характарыстыка вучэбнай літаратуры.

Асаблівасці гістарычнага шляху беларускага народа. Тэрыторыя і прыродныя ўмовы. Эвалюцыя назваў краю і насельнікаў. Перыядызацыя гісторыі Беларусі. Гісторыя як памяць народа. Важнейшыя крыніцы па гісторыі Беларусі. Навуковыя і вучэбныя выданні крыніц.

Асэнсаванне гістарычнага лёсу беларусаў. Канцэпцыі польскіх і расійскіх гісторыкаў. Зараджэнне і развіццё беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі. Вывучэнне гісторыі Беларусі ў савецкай гістарычнай навуцы. Дасягненні замежных вучоных. Сучасны стан беларускай гістарыяграфіі і гістарычнай свядомасці грамадства. Роля гістарычных ведаў у нацыянальна-культурным адраджэнні народа і станаўленні суверэннай дзяржавы – Рэспублікі Беларусь.

**Першапачатковае засяленне.** Сляды знаходжання першых пасяленцаў, старажытныя стаянкі. Неандэртальцы і краманьёнцы. Умовы жыцця, прылады працы і зброя, асноўныя заняткі. Крэмнездабываючая справа. Мацярынская радавая абшчына як сацыяльная арганізацыя. Плямёны і археалагічныя культуры каменнага веку, меркаванні аб іх этнічнай прыналежнасці. Рэлігійныя вераванні і абрады. Першабытнае мастацтва.

**Насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў эпоху бронзы і раннім жалезным веку.** З'яўленне індаеўрапейцаў, іх балцкая галіна на беларускіх землях. Узаемадзеянне з даіндаеўрапейскім насельніцтвам. Узнікненне і развіццё вытворчых формаў гаспадарання. Плаўка і апрацоўка металаў. Зараджэнне грамадскага падзелу працы. Першапачатковы абмен. Бацькоўскі (патрыярхальны) род. Матэрыяльная і духоўная культура плямён бронзавага і жалезнага вякоў.

**Рассяленне славян.** Генезіс усходнеславянскіх плямён і шляхі іх рассялення па тэрыторыі Беларусі. Узаемаадносіны з балтамі. Праблема паходжання беларусаў. Далейшае развіццё і індывідуалізацыя вытворчасці. Сельская абшчына («мір»). Паселішчы і гарадзішчы. Разлажэнне першабытнаашчынных

адносін. Узнікненне класавага грамадства. Саюзы плямён («княжанні»). Рэлігія і культура крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў.

## Тэма 2. Раннефеадальныя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях (IX – першая палова XIII ст.)

Крыніцы і гістарыяграфія.

**Першыя княствы-дзяржавы.** Вытокі дзяржаўнасці Беларусі. Узнікненне княстваў. Старажытнабеларускія землі і Кіеўская Русь.

Дзяржаўнасць Полацкай зямлі. Узаемаадносіны Полацка з Кіевам і Ноўгарадам. Рагвалод і Рагнеда. Усталяванне дынастыі Ізяславічаў. Княства пры Брачыславе. Усяслаў Полацкі. Бітва на Нямізе. Барацьба Уладзіміра Манамаха з Усяславам. Значэнне дзейнасці Уладзіміра Манамаха.

Утварэнне Тураўскага княства. Княжанне Святаполка Уладзіміравіча. Адносіны Турава з Кіевам. Паступовае ўзвышэнне Пінска.

Беларускія землі ў Смаленскім, Чарнігаўскім, Кіеўскім, Уладзіміра-Валынскім княствах.

**Феадальная раздробленасць.** Прычыны і наступствы феадальнай раздробленасці. Княжацкія ўдзелы. Усобіцы.

Драбленне Полацкай зямлі. Узвышэнне Мінска ў час праўлення князя Глеба. Барацьба полацкіх і кіеўскіх князёў. Падзел Тураўскай зямлі, князь Юрый Тураўскі. Княствы ў беларускім Пабужжы і Панямонні, воласці ў Пасожжы.

Арганізацыя кіравання і дзяржаўны лад у землях-княствах. Звычаёвае і пісьмовае права. Пачаткі судаводства.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё.** Шматукладнасць эканомікі. Стан сельскай гаспадаркі, асноўныя прылады апрацоўкі глебы і вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў. Узнікненне гарадоў, іх знешні выгляд, колькасць і геаграфічнае размяшчэнне. Гарадское рамяство. Унутраны і знешні гандаль. Дагавор Смаленска, Полацка і Віцебска з Рыгай у 1229 г.

Развіццё феадальных адносін на землях Беларусі. Пашырэнне зямельнай уласнасці свецкіх і царкоўных феадалаў, узмацненне іх улады на месцах. Шляхі закабалення свабодных сялян-абшчыннікаў. Формы феадальнай эксплуатацыі. Сацыяльнае расслаенне грамадства.

**Барацьба з крыжацкай агрэсіяй і нашэсцем мангола-татараў.** Знешнепалітычнае становішча беларускіх зямель у пачатку XIII ст. Напад нямецкіх феадалаў на Усходнюю Прыбалтыку і Полацкую зямлю. Кукенойскі князь Вячка, герцыкскі князь Усевалад, полацкі князь Уладзімір – арганізатары змагання супраць крыжакоў. Удзел палачан у разгроме шведскіх захопнікаў у бітве на Няве (1240). Роля насельніцтва беларускіх зямель у стрымліванні нямецкага прасоўвання на ўсход у XIII ст. Легендарныя звесткі аб сутыкненнях

з войскамі мангола-татараў на землях Беларусі ў сярэдзіне XIII ст. Бітва каля Магільна. Роля беларускага народа ў барацьбе з мангола-татарамі.

**Рэлігія і культура.** Перадумовы хрысціянізацыі. Першыя хрысціяне на беларускіх землях. Заснаванне Полацкай і Тураўскай епархій. Праблемы распаўсюджвання новай веры. Дваяверства. Вынікі і значэнне прыняцця хрысціянства.

Вусная народная творчасць. Паданні пра Рагнеду і Усяслава Чарадзея. Узнікненне школ, бібліятэк. Пісьменнасць і навуковыя веды. Перакладная і арыгінальная літаратура. Гістарычная проза. «Троя», «Александрыя». Летапісы. Полацкая асветніца Ефрасіння. Літаратурная дзейнасць Кірылы Тураўскага. Клімент Смаляціч. Аўрамій Смаленскі. Архітэктура. Жывапіс. Прыкладное мастацтва.

Вытокі беларускага этнасу.

## Тэма 3. Утварэнне і станаўленне Вялікага Княства Літоўскага (другая палова XIII–XIV ст.)

Асноўныя падыходы да праблемы ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага ў гістарыяграфіі. Агляд асноўных крыніц.

**Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага.** Першыя звесткі пра Літву. Аб'яднаўчыя працэсы ў балта-ўсходнеславянскім рэгіёне ў пачатку XIII ст. Уплыў знешнепалітычнай сітуацыі на ўтварэнне дзяржавы ў верхнім і сярэднім Панямонні. Сацыяльна-эканамічныя перадумовы фарміравання ВКЛ. Роля Навагрудка ў заснаванні дзяржавы. Міндоўг і яго палітыка. Княжанне Войшалка, Трайдзеня, Віценя, Гедзіміна і Альгерда. Уключэнне ў склад ВКЛ Полацкага, Віцебскага, Менскага княстваў і падняпроўскіх зямель. Супрацьстаянне з Ордэнам. Давыд Гарадзенскі. Бітва на Сініх Водах. Значэнне Вялікага княства Літоўскага ў гісторыі беларускага народа.

**Дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага.** Сталіцы, герб і мова дзяржаўнага справаводства. Органы дзяржаўнай улады і кіравання. Вялікі князь. Гаспадарская рада. Узнікненне вялікага «вальнага» сойма і сфера яго кампетэнцыі. Вышэйшыя службовыя асобы: маршалак земскі, канцлер, падканцлер, падскарбій земскі, гетманы. Дворныя ўраднікі. Сістэма мясцовага кіраўніцтва дзяржавай: удзельныя князі, ваяводы, кашталяны, старосты і дзяржаўцы. Судовая сістэма і асаблівасці яе існавання ў XIV–XV ст.

**Эканамічнае развіццё і сацыяльныя адносіны.** Развіццё прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы. Феадальнае землеўладанне: дзяржаўнае, свецкае і царкоўнае. Магнаты, шляхта, баяры, зямяне. Сялянская гаспадарка і павіннасці сялян, іх юрыдычны стан. «Дымы» і «дворышчы». Вёскі, сёлы і воласці. Мясцовая адміністрацыя.

Гарады і замкі. Склад гарадскога насельніцтва. Рамяство і гандаль. Магдэбургскае права і яго роля ў эканамічным і грамадска-палітычным жыцці гарадоў.

## РАЗДЗЕЛ II.
## БЕЛАРУСЬ У КАНЦЫ XIV–XVI СТ.

### Тэма 4. Умацаванне Вялікага Княства Літоўскага (канец XIV–XV ст.)

**Абвастрэнне ўнутраных супярэчнасцей у Вялікім Княстве Літоўскім у канцы XIV ст.** Дынастычная барацьба ў 70-я гг. XIV ст. Кейстут, Ягайла, Андрэй Полацкі, Вітаўт. Умовы пагаднення паміж вялікім князем маскоўскім Дзмітрыем Іванавічам Данскім і маці Ягайлы Ульянай Цвярской. Падрыхтоўка, заключэнне, змест і вынікі Крэўскай уніі. Агульназемскі прывілей 1387 г. і яго сутнасць. Пачатак распаўсюджвання каталіцтва ў Беларусі.

Узмацненне палітычных супярэчнасцяў паміж феадаламі каталіцкага і праваслаўнага веравызнанняў. Польска-ліцвінскія канфлікты і практычнае скасаванне Крэўскай уніі. Востраўскае пагадненне.

**Княжанне Вітаўта, яго ўнутраная і знешняя палітыка.** Ліквідацыя буйных княстваў і ўмацаванне пазіцый цэнтральнай улады. Абласныя прывілеі і іх значэнне. Бітва на рацэ Ворскла і яе значэнне. Пашырэнне агрэсіі нямецкіх феадалаў на ўсход. Чарговае збліжэнне Вялікага Княства Літоўскага з Польскай Каронай. «Вялікая вайна». Разгром крыжакоў пад Грунвальдам. Гарадзельскі прывілей 1413 г. Рэлігійная палітыка Вітаўта.

Барацьба феадальных груповак за ўладу ў 30-я гг. XV ст. і змены ў кіраўніцтве дзяржавай. Прывілеі вялікіх князёў літоўскіх праваслаўнай знаці 1432 і 1434 гг.

**Казімір IV і яго палітыка.** Абранне Казіміра вялікім князем. Паўстанне «чорных людзей» у Смаленску, хваляванні ў Віцебску, Полацку, на Валыні, Жмудскай зямлі. Агульназемскі прывілей 1447 г. і яго значэнне. Пачатак юрыдычнага афармлення прыгоннага права. «Судзебнік» Казіміра IV 1468 г. Адносіны Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай. Усходняя палітыка Казіміра. «Змова князёў» 1480–1481 гг. Спробы аддзялення ад Вялікага Княства Літоўскага часткі беларускіх зямель.

**Культура Беларусі ў XIV–XV ст.** Этнічныя працэсы на беларускіх землях, складванне адметных рыс беларускага народа (мова, звычаі, традыцыі, характар). Этнічная самасвядомасць. Пытанне аб паходжанні назвы «Белая Русь».

Асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры. Дойлідства, жывапіс, скульптура. Кніжная справа. Летапісанне. Арыгінальная і перакладная літаратура.

## Тэма 5. Беларусь у XVI ст.

Гістарыяграфія праблемы і асноўныя крыніцы.

**Знешняя палітыка і войны Вялікага Княства Літоўскага ў першай палове XVI ст.** Адносіны Вялікага Княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай. Ідэалагічнае абгрунтаванне прэтэнзій Вялікага Княства Маскоўскага на валоданне беларускімі землямі. Войны паміж суседнімі княствамі канца XV – першай паловы XVI ст., іх вынікі. Бітва на Ведрашы, абарона Смаленска, бітва пад Оршай. Паспалітае рушанне (усеагульнае апалчэнне) як аснова вайсковай арганізацыі ВКЛ у XVI ст. Узбраенне войска. Пачатак пераходу ад паспалітага рушання да наёмнага, прафесійнага войска. Набегі крымскіх татар і барацьба з паўднёвым агрэсарам. Бітва пад Клецкам. Мяцеж Міхаіла Глінскага. Асоба М. Глінскага і яго роля ў кіраўніцтве дзяржавай. Аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны, мэта выступлення М. Глінскага. Галоўныя падзеі мяцяжу, яго сувязь з маскоўскім дваром. Непасрэдныя і далёкасяжныя вынікі мяцяжу. Мерапрыемствы па ўмацаванні дзяржаўнай абароны ў 40–50-я гг. XVI ст.

**Эвалюцыя дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага.** Агульназемскія прывілеі 1492 і 1506 гг. Абмежаванне ўлады вялікага князя і пашырэнне правоў паноў-рады. Увядзенне павятовага сойміка і рэформа вялікага вальнага сойма. Мясцовае кіраванне: ваяводскі, павятовы, гарадскі і валасны ўзроўні. Адметныя рысы мясцовага кіравання ў Полацкай і Віцебскай землях. Суды і заканадаўства. Статуты Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг. Судовая рэформа. Галоўны Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага.

**Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Вялікага Княства Літоўскага.** Утварэнне першых ваяводстваў. Колькасць і прыкладныя межы. Віленскі сойм 1565–1566 гг. і яго рашэнні. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная і вайсковая рэформы. Адміністрацыйныя функцыі ваяводскіх і павятовых цэнтраў (гаспадарчыя, вайсковыя, судовыя).

**Змены ва ўнутрыпалітычным жыцці дзяржавы ў 20–60-я гг. XVI ст.** Пераўтварэнне шляхты ў карпаратыўнае саслоўе і вылучэнне шляхецкай палітычнай праграмы. Палітыка верацярпімасці ў практыцы палітычнага жыцця ВКЛ. Афіцыйная адмена Гарадзельскага прывілея. Супярэчнасці паміж магнатэрыяй і асноўнай часткай шляхецкага саслоўя ў барацьбе за шляхецкія вольнасці. Рэформы сярэдзіны 60-х гг. XVI ст. і Статут 1566 г. як вынік рэалізацыі шляхецкай палітычнай праграмы.

**Лівонская вайна.** Прычыны Лівонскай вайны і расклад сіл перад яе пачаткам. Пачатак баявых дзеянняў і ўступленне ў вайну Вялікага Княства Літоўскага. Захоп маскоўскім войскам Полацка. Бітва на р. Ула. Вызваленне Полацка. Заключны этап вайны і яе вынікі.

**Люблінская унія 1569 г.** Унутры- і знешнепалітычныя прычыны аб'яднання ВКЛ з Польшчай. Падрыхтоўка Люблінскага сойма. Дамаганні шляхты і пазіцыя магнатаў у адносінах да новай уніі. Пачатак работы Люблінскага сойма, спрэчкі аб умовах уніі. Далучэнне да Польшчы Падляшша, Валыні, Падолля і Кіеўшчыны. Падпісанне акта аб утварэнні Рэчы Паспалітай, яго змест і значэнне.

**Барацьба за захаванне самастойнасці ВКЛ.** Незадаволенасць пануючага саслоўя ВКЛ вынікамі уніі з Польшчай. Антыпольскія настроі і барацьба за «старыну». Захаванне агульнадзяржаўных соймаў ВКЛ. «Генрыхавы артыкулы». Стэфан Баторый, яго ўнутраная і знешняя палітыка. Распрацоўка і прыняцце Статута 1588 г. Дзейнасць брацтваў. Л. Сапега. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Маскоўскую дзяржаву ў пачатку XVII ст. Барацьба за Смаленск у 30-я гг. XVII ст.

**Гарадское жыццё на беларускіх землях.** Колькасны рост гарадоў і гарадскога насельніцтва. Знешні воблік і функцыі гарадоў. Унутраная арганізацыя гарадскога жыцця. Супярэчнасці паміж гарадамі і буйнымі землеўладальнікамі. Сацыяльныя ўнутрыгарадскія канфлікты. Цэхавая арганізацыя працы гарадскіх рамеснікаў. Унутраны і знешні гандаль беларускіх гарадоў.

**Усталяванне фальваркава-паншчыннай сістэмы і прыгонніцтва ў Беларусі.** Феадальнае землеўладанне. Адлучэнне земляроба ад зямельнай уласнасці. З'яўленне і распаўсюджванне фальваркаў. Аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст. «Валочная памера» і яе сутнасць. Тыпы, віды і нормы павіннаснага абкладання сялян. Сяляне цяглыя, асадныя, агароднікі, слугі. Працэс запрыгоньвання сялян. Асноўныя формы антыфеадальнага пратэсту сялян.

**Царква і рэлігія ў Беларусі.** Прывілеяванае становішча каталіцкай царквы ў ВКЛ. Паступовы крызіс праваслаў'я. Рэфармацыйны рух. Пачатак Рэфармацыі ў Беларусі. Лютэранства і кальвінізм. Антытрынітарызм і сацыніянства. Дзеячы Рэфармацыі (Мікалай Радзівіл Чорны, С. Будны, В. Цяпінскі). Контррэфармацыя. Езуіты і іх дзейнасць у Беларусі. Ідэя царкоўнай уніі. Каляндарная рэформа і яе сутнасць. Прыхільнікі і праціўнікі уніі. Берасцейскі царкоўны сабор, прыняцце уніяцтва і яго сутнасць. Барацьба вакол уніяцкага пытання ў канцы XVI – першай палове XVII ст.

**Беларускае Адраджэнне.** Сувязь беларускага Адраджэння з заходнееўрапейскім. Гуманізм. Філасофскія ідэалы і погляды на жыццё

Ф. Скарыны. Дзеячы Адраджэння: М. Гусоўскі, Я. Вісліцкі, Л. Сапега. Кнігадрукаванне. Выданні Ф. Скарыны. І. Фёдараў і П. Мсціславец. Сістэма адукацыі ў ВКЛ. Свецкая і царкоўная літаратура. Летапісы і мемуары. Грамадска-палітычная і філасофская думка.

## РАЗДЗЕЛ III.
## БЕЛАРУСЬ У XVII–XVIII ст.

### Тэма 6. Беларусь у XVII – першай палове XVIII ст.

Гістарыяграфія і асноўныя крыніцы па праблеме.

**Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст.** Эканамічнае развіццё. Стан сельскай гаспадаркі, рамяства і гандлю. Гарадскія паўстанні канца XVI – першай трэці XVII ст. Абвастрэнне ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў сувязі з увядзеннем Брэстскай царкоўнай уніі. Антыўніяцкія хваляванні. Вайна Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1600–1629 гг. і яе ўплыў на ВКЛ. Беларускія землі ў час войн Рэчы Паспалітай з Расіяй.

**Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг.** Яе прычыны, характар і асаблівасці. Паўстанне на чале з Б. Хмяльніцкім на Украіне і яго ўплыў на разгортванне антыфеадальнага руху на паўднёва-ўсходніх землях Беларусі. Казацкія загоны і іх кіраўнікі. Грамадска-саслоўны склад паўстанцаў. Баявыя дзеянні ў 1648–1649 гг. пад Пінскам, Мазыром і Бабруйскам. Бітва пад Лоевам. Вынікі казацка-сялянскай вайны.

**Вайна Рэчы Паспалітай з Расіяй 1654–1667 гг.** Прычыны і пачатак вайны. Ход і характар баявых дзеянняў. Наступ расійскіх войскаў у ВКЛ у 1654–1655 гг. Абарона Смаленска, Віцебска, Мсціслава. Захоп Вільні. Перамір'е ў Нямежы. Палітыка царскіх улад у Беларусі. Пазіцыя шляхты і магнатаў ВКЛ. Антыфеадальныя выступленні сялян і гараджан.

Умяшанне ў канфлікт Швецыі. Спробы разрыву уніі Вялікага Княства Літоўскага з Польскім каралеўствам. Палітычная і вайсковая дзейнасць гетмана Я. Радзівіла. Кейданская унія.

Ваенныя дзеянні 1658–1666 гг. Вызваленне Вільні. Паўстанне ў Магілёве. Андрусаўскае перамір'е. Вынікі вайны для Беларусі. Умовы «вечнага міру» 1686 г. з Расіяй.

**Эканамічнае становішча і сацыяльныя супярэчнасці.** Эканамічны заняпад і яго прычыны. Фінансавы крызіс. Магнацкае землеўладанне. Сялянская і панская гаспадарка. Беларускія гарады і мястэчкі. Рамяство і гандаль.

Эвалюцыя феадальнай рэнты. Дзяржаўныя падаткі. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцяў у гарадах. Сялянскія хваляванні ў Крычаўскім старостве і на Каменшчыне.

**Дзяржаўна-палітычны крызіс.** Арганізацыя ўлады і кіравання ў ВКЛ. Аслабленне ўлады манарха. Адсутнасць эфектыўнай цэнтральнай выканаўчай улады ў дзяржаве. Недзеяздольнасць вальных соймаў. Ваяводскія і павятовыя соймікі. Сацыяльна-палітычнае дамінаванне магнатаў. Становішча дробнай і сярэдняй шляхты.

Узмацненне феадальнай анархіі. Саперніцтва паміж ВКЛ і Каронай. Грамадзянская вайна 1696–1700 гг. у ВКЛ. Праграма «каэквацыі правоў» ліцвінскай і польскай шляхты. Бітва пад Алькенікамі. Віленская пастанова. Чарговая спроба разрыву уніі ВКЛ з Каралеўствам Польскім.

Рэлігійныя праблемы ў дзяржаве. Замацаванне верхавенства каталіцкага касцёла. Поспехі уніяцтва. Становішча пратэстантаў і праваслаўных. Яўрэі і мусульмане ў Беларусі.

**Паўночная вайна ў Беларусі.** Міжнародныя адносіны ў Еўропе напярэдадні вайны. Прычыны і пачатак Паўночнай вайны. Асаблівасці ўступлення ў яе Вялікага Княства Літоўскага. Дамовы антысапегаўскай кааліцыі з Пятром І. Ход баявых дзеянняў. Паводзіны іншаземных войскаў. Адносіны насельніцтва да ваюючых бакоў.

Абвяшчэнне манархам Станіслава Ляшчынскага. Дэтранізацыя Аўгуста ІІ. Сандамірска-Віленская канфедэрацыя. Рашэнні «нямога» сейма. Узмацненне расійскіх уплываў ва ўнутранай і знешняй палітыцы.

Вынікі вайны для Беларусі.

**Культура.** Гістарычныя ўмовы развіцця культуры беларускага народа. Прычыны ўзмацнення паланізацыі феадальнай вярхушкі і яе вынікі. Пераход справаводства ў ВКЛ на польскую мову.

Стан школьнай асветы і выхавання. Езуіцкія калегіумы. Віленская акадэмія і яе роля ў распаўсюджванні навуковых ведаў. «Вялікае мастацтва артылерыі» К. Семяновіча. Развіццё фальклору. Тэатр. Інтэрмедыі. Батлейка. Свецкая і духоўная літаратура. Кнігадрукаванне. Грамадска-палітычная думка. С. і Л. Зізаніі, Л. Карповіч, І. Пацей, П. Скарга, М. Сматрыцкі, А. Філіповіч. Горадабудаўніцтва і архітэктура. Выяўленчае мастацтва. Культура Беларусі ў кантэксце славянскай і еўрапейскай культур. С. Полацкі і яго дзейнасць. А. Белабоцкі, К. Лышчынскі, І. Капіевіч, С. Шчука і планы сацыяльна-палітычных рэформ.

Архітэктура, скульптура і жывапіс. Барока. Развіццё прыкладнога мастацтва.

## Тэма 7. Беларусь у другой палове XVIII ст.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё.** Нармалізацыя эканамічнага развіцця пасля ваенных разбурэнняў. Аднаўленне сельскай і гарадской гаспадаркі. Рост насельніцтва. Развіццё шляхоў зносін.

Паглыбленне крызісу феадальнага спосабу вытворчасці. Панская гаспадарка і спробы яе рацыяналізацыі. Рэфарматарская дзейнасць А. Тызенгаўза, Я. Храптовіча. Сялянская гаспадарка і катэгорыі сялян. Вотчынныя мануфактуры. Развіццё ўнутранага і знешняга гандлю. Становішча гарадоў. Характар і вынікі эканамічнага ажыўлення.

Стан гарадскога і вясковага насельніцтва. Антыфеадальныя выступленні беларускага сялянства ў другой палове XVIII ст.

**Спробы дзяржаўных рэформ. Першы падзел Рэчы Паспалітай.** Паглыбленне дзяржаўна-палітычнага крызісу. Праекты рэформы Чартарыйскіх («фаміліі»). Змены ў ладзе і кіраванні на пачатку праўлення Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Рашэнні сеймаў 1764 і 1766 гг. Умяшанне замежных дзяржаў ва ўнутраныя справы. Дысідэнцкае пытанне. Сейм 1767–1768 гг. Кардынальныя правы. Барская канфедэрацыя ў ВКЛ (1768–1771).

Роля Прусіі, Аўстрыі і Расіі ў першым падзеле Рэчы Паспалітай. Рашэнні сейма 1773 г. Апазіцыя на сейме на чале з Т. Рэйтанам, С. Корсакам і С. Багушэвічам. Усталяванне Пастаяннай Рады. Арганізацыя Адукацыйнай камісіі. Далучэнне ўсходняй часткі Беларусі да Расійскай імперыі.

**Чатырохгадовы (Вялікі) Сейм. Другі падзел Рэчы Паспалітай.** Грамадска-палітычныя супярэчнасці. Кодэкс А. Замойскага. Спыненне рэформ і расійская гарантыя. Складванне шляхецка-буржуазнага блоку. Склікание і рэформы Чатырохгадовага сейма. Павелічэнне войска. Ліквідацыя Пастаяннай Рады і разрыў саюза з Расійскай імперыяй. Рэформа мясцовага шляхецкага самакіравання. Змены ў становішчы мяшчан. Пінская кангрэгацыя. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Статус ВКЛ. Барацьба ўнутраных і знешніх сіл супраць Канстытуцыі. Таргавіцкая канфедэрацыя. Рашэнні Гарадзенскага сейма 1793 г. Другі падзел дзяржавы і далучэнне цэнтральнай часткі Беларусі да Расійскай імперыі.

**Паўстанне 1794 г. Трэці падзел Рэчы Паспалітай.** Прычыны, падрыхтоўка і пачатак паўстання. Уплывы французскай буржуазнай рэвалюцыі. «Віленскія якабінцы». Грамадска-палітычныя погляды Т. Касцюшкі, Я. Ясінскага, Т. Ваўжэцкага. Перамога паўстання ў Вільні. Асаблівасці паўстання ў Беларусі. Ход баявых дзеянняў. Бітвы пад Палянамі, Соламі, Крупчыцамі. Партызанска-дыверсійныя рэйды М.К. Агінскага і С. Грабоўскага. Адносіны да паўстання сялян. Паланецкі універсал. Палітыка расійскага ўрада. Вайсковыя аперацыі царскіх войскаў. Значэнне і прычыны паражэння паўстання.

Трэці падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне да Расійскай імперыі заходняй часткі Беларусі. Прычыны ліквідацыі Рэчы Паспалітай.

**Беларускія землі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (1772–1801 гг.).** Увядзенне новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу і арганізацыя кіравання. Судаводства. Змены ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, унутраным і знешнім гандлі. Паштовыя дарогі. Стан гарадоў.

Прывядзенне да прысягі і афармленне сацыяльнага статусу насельніцтва. Правы і прывілеі пануючага саслоўя. Падаткі і павіннасці. Насаджэнне рускага дваранскага землеўладання. Нацыянальна-рэлігійная палітыка расійскага ўраду.

**Культура.** Асветніцтва. Своеасаблівасць і супярэчлівасць эпохі асветніцтва ў Беларусі. Дзейнасць Адукацыйнай Камісіі. Галоўная школа Вялікага Княства Літоўскага (Віленская Акадэмія). Гарадзенская медыцынская школа. Дасягненні ў прыродазнаўчых навуках. М. Пачобут-Адляніцкі, Ж. Жылібер.

Ідэі асветніцтва ў літаратуры і грамадскай думцы. С. Майман, К. Нарбут, І. Яленскі, С. Шадурскі, М. Карповіч. Фізіякраты. Мецэнацтва. Тэатр. Музычнае мастацтва. «Камедыі» К. Марашэўскага і М. Цяперскага. Друк, першыя газеты.

Архітэктура і жывапіс. Барока. Класіцызм. Палацава-сядзібныя забудовы.

## РАЗДЗЕЛ IV.
## БЕЛАРУСЬ У XIX СТ.

### Тэма 8. Беларусь у першай палове XIX ст.

Новы перыяд у гісторыі Беларусі, яго асноўныя рысы. Перыядызацыя. Айчынная і замежная гістарыяграфія. Крыніцы. Іх класіфікацыя.

**Тэрыторыя і насельніцтва.** Адміністрацыйны падзел. Прыродныя рэсурсы. Уплыў геаграфічнага і дэмаграфічнага фактараў на сацыяльнае і эканамічнае развіццё. Сацыяльная і нацыянальна-рэлігійная структура насельніцтва. Яе асаблівасці. Катэгорыі сялян. Становішча і склад гарадскога насельніцтва.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё на зыходзе прыгонніцтва.** Разлажэнне феадальна-прыгонніцкага ладу і фарміраванне капіталістычных адносін. Развіццё таварнай вытворчасці ў сельскай гаспадарцы. Пачатак яе спецыялізацыі. Новыя з'явы ў агратэхніцы. Прамысловая дзейнасць сялянства, узровень яго дыферэнцыяцыі.

Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Спробы яе рацыяналізацыі. Узмацненне феадальнай эксплуатацыі сялянства. Хваляванні сялян дзяржаўных і прыватнаўласніцкіх маёнткаў, іх антыпрыгонніцкая накіраванасць.

Структура і формы арганізацыі прамысловай вытворчасці. Вотчынныя і купецкія мануфактуры. Пачатак прамысловага перавароту. Рост выкарыстання

наёмнай працы. Будаўніцтва дарог і каналаў. Гандаль. Кірмашы. Узрастанне ролі гарадоў і мястэчкаў.

**Вайна 1812 г. і Беларусь.** Расійска-французскія адносіны і палітычная сітуацыя ў заходніх губернях напярэдадні вайны. Перадача Расіі Беластоцкай вобласці. Праект адраджэння Вялікага Княства Літоўскага.

Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 г. Палітыка французскіх улад. Дзейнасць Часовай камісіі ўрада Вялікага Княства Літоўскага. Адносіны шляхты да Напалеона. Пазіцыі сялянства. Партызанскі рух. Удзел насельніцтва Беларусі ў баявых дзеяннях. Разгром французскіх войскаў на Бярэзіне. Вынікі вайны для Беларусі.

**Урадавая палітыка.** «Польскае пытанне» і ўрадавая палітыка. Эвалюцыя саслоўнай палітыкі. Ваенныя пасяленні. Актуалізацыя сялянскага пытання ў другой чвэрці XIX ст. Люстрацыя дзяржаўных маёнткаў. Інвентарная рэформа. Канфесіянальная палітыка. Полацкі царкоўны Сабор і яго вынікі. Змяненні палітыкі ў галіне асветы. Заканадаўства. Камітэт па справах заходніх губерняў і яго дзейнасць. Русіфікацыя і яе сутнасць.

**Светапогляд рамантызму і грамадска-палітычнае жыццё.** «Вясна народаў» і ажыўленне грамадска-палітычнага руху. Характар і сацыяльна-саслоўны склад яго ўдзельнікаў. Грамадска-палітычнае жыццё і яго накірункі. Фізіякраты. Масонства. Тайныя таварыствы вучнёўскай моладзі і іх дзейнасць. Дзекабрысты. Беларусь у планах дзекабрыстаў. Бабруйскі план паўстання. «Таварыства ваенных сяброў». Выступленне дзекабрыстаў у Літоўскім корпусе і ў Бабруйскай крэпасці. Разгром тайных таварystваў.

Шляхецкае паўстанне 1830–1831 гг. Яго мэты і праграма дзеянняў. Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт. Развіццё паўстання ў заходніх і паўднёвых раёнах Беларусі. Мабілізацыя сялян і мяшчан. Бітва за Вільню. Падаўленне паўстання. Вынікі падзей 1831 г. Ліцвінскі патрыятызм сярод мясцовай шляхты.

Уплыў рэвалюцыйных падзей у Заходняй Еўропе на грамадска-палітычны рух у Беларусі. «Экспедыцыя Валовіча». «Дэмакратычнае таварыства». Ф. Савіч. «Саюз свабодных братоў». Зараджэнне беларускага нацыянальна-культурнага руху.

«Заходнерусізм» і яго прадстаўнікі: мітрапаліт літоўскі І. Сямашка, І. Грыгаровіч і інш.

**Культура. Ад асветніцтва да рамантызму.** Новае ў культуры: рацыяналізм і дэмакратызацыя. Сацыяльная структура культуры: магнацкая, памесна-дваранская культура сярэдняй і дробнай шляхты. Культура мяшчан і насельніцтва гарадоў і мястэчак. Сялянская культура. Культурныя цэнтры Беларусі.

Асвета. Фарміраванне сістэмы свецкай і духоўнай адукацыі. Віленская навучальная акруга. Віленскі універсітэт. Полацкая езуіцкая акадэмія. Гімназіі. Павятовыя вучылішчы. Царкоўнапрыходскія і парафіяльныя школы. Змены ў сістэме адукацыі. Беларуская навучальная акруга. Віцебская настаўніцкая семінарыя. Ваеннае і прафесійнае навучанне. Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Духоўная адукацыя. Узнікненне яўрэйскіх навучальных устаноў.

Навука. Зараджэнне і развіццё археаграфіі, крыніцазнаўства, славяназнаўства, беларусазнаўства, этнаграфіі і археалогіі. З. Даленга-Хадакоўскі, М. Баброўскі, І. Даніловіч, К. і Я. Тышкевічы і інш. Прыродазнаўчыя веды: батаніка, біялогія, фізіялогія, хімія.

Станаўленне новай беларускай мовы і літаратуры. Рамантызм: А. Міцкевіч, Я. Чачот, У. Сыракомля, Я. Баршчэўскі. Пераход да рэалізму. В. Дунін-Марцінкевіч. Ананімная паэзія.

Мастацтва. Тэатр. Музыка. А. Абрамовіч, М. Агінскі, Д. Стэфановіч, Ф. Міладоўскі, С. Манюшка.

Архітэктура і горадабудаўніцтва. Палацава-сядзібнае будаўніцтва. Класіцызм. Неаготыка. Жывапіс. Віленская школа жывапісу. Я. Дамель, І. Аляшкевіч, В. Ваньковіч, І. Хруцкі, В. Дмахоўскі. Графіка. Скульптура.

Уклад выхадцаў з Беларусі ў развіццё навукі і культуры іншых народаў. Выспяванне беларускай нацыянальнай ідэі.

## Тэма 9. Беларусь у другой палове XIX ст.

Асноўныя напрамкі і вынікі навуковых даследаванняў. Перспектывы далейшага вывучэння. Класіфікацыя крыніц і іх асноўныя віды. Масавыя статыстычныя даныя. Апублікаваныя матэрыялы перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г.

**Мадэрнізацыйныя працэсы ў Беларусі.** Мадэрнізацыя, яе сутнасць, этапы, характэрныя і спецыфічныя рысы яе эвалюцыі ў Беларусі. Фарміраванне сацыяльнай структуры буржуазнага грамадства, незавершанасць гэтага працэсу ў Беларусі. Мадэрнізацыя і працэсы індустрыялізацыі, урбанізацыі, станаўлення нацыі, змены ў менталітэце беларускага грамадства.

**Адмена прыгоннага права.** Наспяванне неабходнасці падрыхтоўкі сялянскай рэформы, яе прычыны. Арганізаваная ініцыятыва інвентарных камітэтаў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў па вызваленні сялян. Рэскрыпт У. І. Назімаву. Маніфест і «Палажэнні» 19 лютага 1861 г. Спецыфіка мясцовых «Палажэнняў» для Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губерняў. Выкупная аперацыя. Устаўныя граматы і выкупныя акты. Правы сялян. Змены ў рэалізацыі рэформы, звязаныя з паўстаннем 1863 г. Рэформы аграрных

адносін дзяржаўных сялян і ўпарадкаванне іншых катэгорый сельскага насельніцтва. Вынікі і значэнне аграрных рэформ.

**Буржуазныя рэформы 60–70-х гг. ХІХ ст.** Ваенная, школьная, цэнзурная, судовая, гарадскога самакіравання рэформы, іх прычыны, сутнасць і асаблівасці рэалізацыі ў Беларусі. Значэнне рэформ. Контррэформы і іх вынікі. Увядзенне інстытута земскіх начальнікаў.

**Урадавая палітыка.** Асаблівасці эканамічнай і саслоўнай палітыкі ў Беларусі. Абмежаванні ў дачыненні да палякаў, беларусаў-католікаў. Заканадаўства ў адносінах да яўрэяў. Пашырэнне рускага землеўладання. Сервітутнае пытанне. Рэформы ў сістэме падаткаў і павіннасцей.

Змены ва ўрадавай палітыцы ў Беларусі па нацыянальным і рэлігійным пытаннях. Умацаванне «традыцыяналісцкіх» пачаткаў ва ўрадавай палітыцы Беларусі. Русіфікацыя Беларусі.

**Сельская гаспадарка.** Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне. Асаблівасці буржуазнай эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі. Аграрны крызіс 80-х гг. ХІХ ст. і яго ўплыў на рыначную спецыялізацыю сельскай гаспадаркі. Малочная і мясная жывёлагадоўля. Вытворчасць тэхнічных культур. Вінакурэнне. Скарачэнне дваранскага землеўладання і рост бессаслоўнай зямельнай уласнасці. Становішча сялян. Сацыяльныя працэсы сярод сялянства. Фарміраванне аграрнай буржуазіі. Адыходныя промыслы. Міграцыі сялянства. Сельская грамада, рэгіянальныя асаблівасці яе функцыяніравання ў Беларусі.

**Прамысловасць і гарады.** Спецыялізацыя беларускай прамысловасці, яе галіновая структура. Спецыфічныя рысы тэрытарыяльнага размяшчэння прамысловых прадпрыемстваў. Асаблівасці прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі. Удзельная вага дробнай вытворчасці. Рост гарадоў і іх добраўпарадкаванне. Асаблівасці ўрадавай палітыкі ў дачыненні горадаўтварэння. Мястэчкі. Фарміраванне гандлёва-прамысловай буржуазіі. Колькасць, склад, становішча рабочых.

**Транспарт, гандаль, крэдыт.** Будаўніцтва чыгунак. Важнейшыя чыгуначныя лініі ў Беларусі; іх уплыў на развіццё сельскай гаспадаркі, прамысловасці, гарадоў і гандлю. Рачны транспарт. Фарміраванне фінансава-крэдытнай сістэмы. Дзейнасць у Беларусі аддзяленняў Дзяржаўнага, Сялянскага, Дваранскага і іншых банкаў. Таварыствы ўзаемнага крэдыту. Скарачэнне кірмашоў і развіццё магазінна-крамнага гандлю. Фарміраванне на тэрыторыі Беларусі адзінага эканамічнага рэгіёна.

**Паўстанне 1863 г.** Прычыны паўстання. Актывізацыя грамадскага жыцця напярэдадні паўстання. Варшаўскі нацыянальны і Літоўскі правінцыяльны камітэты. «Чырвоныя» і «белыя»: З. Серакоўскі, Л. Звяждоўскі, В. Урублеўскі, Ф. Ражанскі і інш. К. Каліноўскі і яго дзейнасць. «Мужыцкая праўда». Пачатак паўстання. Маніфест Часовага правінцыяльнага ўрада Літвы і Беларусі.

Арганізацыя паўстанцкіх атрадаў і іх дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. Тактыка «белых». Аддзел кіравання правінцыямі Літвы. Я. Гейштар. Меры царскай адміністрацыі ў сувязі з паўстаннем. М. Мураўёў. Спад паўстанцкага руху. Утварэнне «Літоўска-Беларускага чырвонага жонду». Падаўленне паўстання. «Лісты з-пад шыбеніцы» К. Каліноўскага. Характар і прычыны паражэння паўстання.

**Грамадска-палітычнае жыццё.** Грамадская думка: асноўныя плыні і іх эвалюцыя. Ідэалогія манархізму ў Беларусі. «Заходнерусізм» і яго плыні. М. Каяловіч. Станаўленне ліберальнай думкі. Варшаўскі пазітывізм. «Минский листок». Рэвалюцыйна-дэмакратычная думка. Вытокі ідэалогіі беларускага нацыянальнага руху. Ф. Багушэвіч. К. Каліноўскі. Польскі і яўрэйскі нацыянальныя рухі і іх ідэалогія.

Вытокі і сутнасць народніцтва. Першыя народніцкія гурткі пачатку 1870-х гг. і іх дзейнасць. Народніцкія гурткі другой паловы 1870-х гг. Спробы прапаганды сярод сялян і рабочых. Дзейнасць «Народнай волі». Выхадцы з Беларусі ў народніцкіх арганізацыях Расіі. І. Грынявіцкі, М. Судзілоўскі, С. Кавалік, Р. Ісаеў і інш. Народніцкія арганізацыі ў Беларусі ў першай палове 1880-х гг. Спробы аб'яднання. Група «Гоман» і яе погляды на развіццё Беларусі. Народнікі Беларусі і беларускі нацыянальны рух. Ліберальныя народнікі. Адраджэнне рэвалюцыйнага народніцтва ў канцы 1890-х гг.

Эвалюцыя рабочага руху. Распаўсюджванне марксізму. Э. Абрамовіч, І. Гурвіч, С. Трусевіч, Я. Спонцы, В. Сяліцкі, А. Крэмер. Дзейнасць сацыял-дэмакратыі Польшчы і Літвы. Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя (ЛСДП). Польская сацыялістычная партыя (ППС). Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз (Бунд). «Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі». I з'езд РСДРП. Стварэнне Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ). Асаблівасці сацыял-дэмакратычнага руху ў Беларусі.

**Фарміраванне беларускай нацыі.** Этнічная эмансіпацыя еўрапейскіх народаў у XIX ст. Умовы фарміравання беларускай нацыі. Этнічная тэрыторыя беларусаў, нацыянальны склад насельніцтва. Сацыяльна-класавыя асаблівасці станаўлення беларускай нацыі. Фарміраванне агульных нацыянальных прыкмет. Этнічная і нацыянальная самасвядомасць. Станаўленне беларускай літаратурнай мовы. Самавызначэнне беларускага нацыянальнага руху.

**Культура Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст.** Асноўныя стылі і накірункі ў развіцці культуры. Асвета. Палітыка ўрада ў галіне школьнай справы. Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Тыпы і колькасць школ. Прафесійна-тэхнічная адукацыя. Настаўніцкія семінарыі. Развіццё прыродазнаўчых навук. Вывучэнне этнаграфіі, гісторыі і культуры Беларусі. А. Кіркор, П. Шэйн, І. Насовіч, Е. Раманаў, М. Каяловіч і інш. Публікацыя гістарычных крыніц і помнікаў духоўнай культуры. Развіццё мастацкай літаратуры. Творчасць Ф. Багушэвіча,

А. Гурыновіча, Я. Лучыны, К. Каганца і інш. Рост легальных публікацый на беларускай мове ў 1890-я гг. Быт і матэрыяльная культура, звычаі, абрады, нормы маралі народаў Беларусі. Развіццё перыядачнага друку. «Минский листок».

Тэатр і музыка. Архітэктура і горадабудаўніцтва. Змяненне выгляду беларускіх гарадоў. Эклектыка. Жывапіс. Гістарычны і бытавы жанры: К. Альхімовіч, Д. Баркоўскі. Пейзаж, партрэт. Н. Сілівановіч, Б. Русецкі, А. Ромер, А. Гараўскі. Графіка. Творчасць А. Андрыёлі, Ф. Дмахоўскага, Н. Орды.

## РАЗДЗЕЛ V. БЕЛАРУСЬ У 1900–1939 ГГ.

### Тэма 10. Беларусь у пачатку XX ст.

Агляд навуковай і вучэбнай літаратуры, гістарычных крыніц па перыядзе.

**Беларусь на мяжы XIX–XX ст.** Сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва Беларусі ў пачатку XX ст.; эканамічная і нацыянальная палітыка ўрада ў Беларусі.

Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Структура землеўладання, яе асаблівасці ў Беларусі. Спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці, агратэхніка. Феадальна-прыгонніцкія перажыткі ў беларускай вёсцы, сацыяльная дыферэнцыяцыя сялянства. Аграрная перанаселенасць, міграцыя вясковага насельніцтва. Сялянскія хваляванні.

Стан і развіццё прамысловасці, яе структура і спецыялізацыя. Прамысловы крызіс у Беларусі 1900–1903 гг. Рост акцыянернага капіталу, банкі Беларусі. Пранікненне замежнага капіталу ў эканоміку Беларусі. Транспарт і гандаль. Рост гарадоў. Павелічэнне колькасці рабочага класа, яго нацыянальны і сацыяльны склад. Становішча рабочага класа. Станаўленне буржуазіі.

Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі. Рабочы рух, з’яўленне палітычных партый і арганізацый. Паліцэйскі сацыялізм. Яўрэйская незалежная рабочая партыя. Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Арганізацыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Польскай сацыялістычнай партыі на Літве. Бунд. Сіяніцкі рух. Польскі і яўрэйскі нацыянальныя рухі. Утварэнне і дзейнасць Беларускай сацыялістычнай грамады.

**Рэвалюцыйныя падзеі 1905–1907 гг. у Беларусі.** Абвастрэнне сацыяльных і нацыянальных супярэчнасцяў. Пачатак рэвалюцыі. Уздым выступленняў рабочых, сялян і салдат у студзені – верасні 1905 г. Кастрычніцкая палітычная стачка ў гарадах і мястэчках Беларусі. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. і рэпрэсіі самадзяржаўя. Курлоўскі расстрэл у Мінску. Снежаньскія падзеі ў Беларусі. Дыферэнцыяцыя грамадска-палітычных сіл. Кансерватыўныя партыі і

саюзы, ліберальныя партыі, сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ў Беларусі і характар іх дзейнасці.

Выбарчы закон ад 11 снежня 1905 г., адносіны да яго палітычных партый і арганізацый у Беларусі. Выбары ў І і ІІ Дзяржаўныя думы Расіі, сацыяльны і партыйны склад дэпутатаў ад беларускіх губерняў, іх пазіцыі па пытаннях эканамічнага і палітычнага жыцця краіны. Прычыны роспуску І і ІІ Дзяржаўных дум і адносіны да яго палітычных партый і арганізацый. Уздым рабочага, сялянскага і салдацкага рухаў вясной – летам 1906 г., змены ў іх дынаміцы і характары. Рэвалюцыйныя хваляванні ў Беларусі вясною 1907 г. Трэцячэрвеньскі дзяржаўны пераварот 1907 г. Прычыны паражэння першай расійскай рэвалюцыі і яе значэнне для Беларусі.

Беларускі нацыянальны рух у перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг., роля БСГ. Праграмныя ўстаноўкі БСГ, яе адносіны да І і ІІ Дзяржаўных Дум. ІІ з’езд БСГ. Рашэнні чэрвеньскай (1906) канферэнцыі БСГ. Газеты «Наша доля» і «Наша ніва», іх роля ў развіцці нацыянальна-вызваленчага руху і абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці. Указ 17 красавіка 1905 г. аб свабодзе веравызнання і змены ў канфесійным жыцці.

**Сталыпінскія рэформы.** Мэты і задачы правядзення аграрнай рэформы. Асаблівасці рэалізацыі ў Беларусі. Скасаванне сельскай абшчыны. Насаджэнне хутароў і адрубоў. Перасяленне сялян у азіяцкую частку Расіі. Далейшая спецыялізацыя сельскай гаспадаркі і рост вытворчасці. Узмацненне сацыяльнай дыферэнцыяцыі вёскі. Вынікі сталыпінскай аграрнай рэформы для Беларусі. Пралікі і памылкі ў яе правядзенні.

Прычыны і мэты правядзення земскай рэформы ў беларускіх губернях, яе асаблівасці. Губернскія і павятовыя земскія ўправы і іх роля ў арганізацыі мясцовага кіравання і гаспадарчага жыцця. Значэнне ўвядзення земстваў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях.

**Эканамічнае развіццё і грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў 1907–1914 гг.** Уздым прамысловасці. Рост канцэнтрацыі вытворчасці. Становішча рабочага класа. Сельская гаспадарка. Сацыяльныя зрухі ў вёсцы. Падаткі і павіннасці сялян.

Сутнасць выбарчага закона ад 3 чэрвеня 1907 г. і асаблівасці яго ажыццяўлення ў Беларусі. Палітычныя пазіцыі ўрадавых партый і арганізацый. Ліберальны рух. Аслабленне рэвалюцыйных партый і арганізацый. Дынаміка і характар рабочага і сялянскага рухаў. Грамадска-палітычны рух у Беларусі ў час выбараў у ІІІ і IV Дзяржаўныя думы. Дэпутаты ад беларускіх губерняў у ІІІ і IV Дзяржаўных Думах і іх пазіцыі па пытаннях палітычнага і эканамічнага жыцця краіны.

Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Барацьба самадзяржаўя з беларускім нацыянальна-адраджэнскім рухам. «Наша ніва».

**Культура Беларусі.** Умовы і асаблівасці культурнага развіцця Беларусі. Палітыка ураду ў галіне культуры. Ідэалогія і практыка «заходнерусізму».

Перыядычны друк і выдавецкая справа. Школа, асвета і адукацыя, навука і навуковыя даследаванні. Развіццё беларусазнаўства. Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі і інш. Тэхнічная інтэлігенцыя. М. Р. Стульбінскі, К. М. Паўлоўскі і інш. Развіццё літаратуры і мастацтва. М. Багдановіч, Я. Купала, Я. Колас і інш. Выяўленчае мастацтва. Ф. Рушчыц, В. Бялыніцкі-Біруля. Архітэктура. Беларускі тэатр і музыка. І. Буйніцкі.

## Тэма 11. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1914–1920)

Агляд навуковай і вучэбнай літаратуры, гістарычных крыніц.

**Беларусь у гады Першай сусветнай вайны.** Прычыны і пачатак вайны. Увядзенне ваеннага становішча ў Беларусі. Адносіны да вайны розных груп насельніцтва, палітычных партый і грамадскіх арганізацый. Ваенныя дзеянні на германска-расійскім (Усходнім) фронце ў 1914–1915 гг. Свянцянскі прарыў. Стабілізацыя фронту ў кастрычніку 1915 г. Захоп Заходняй Беларусі войскамі кайзераўскай Германіі. Беларускія тэрыторыі ў складзе Обер-Оста, устанаўленне акупацыйнага рэжыму на захопленай тэрыторыі. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў 1916 г. Нарачанская і Баранавіцкая ваенныя аперацыі. Бежанцтва. Стварэнне і дзейнасць грамадскіх арганізацый бежанцаў і камітэтаў дапамогі ахвярам вайны.

Становішча на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі: прамысловасць, сельская гаспадарка, мілітарызацыя эканомікі, размяшчэнне расійскіх войскаў. Ваенныя павіннасці. Харчовы крызіс. Рост антываенных і антыўрадавых настрояў. Пачатак разлажэння ў войсках. Рост дэзерцірства.

Палітыка нямецкай акупацыйнай адміністрацыі. Беларускі нацыянальны рух у гады вайны. Дзейнасць беларускіх палітычных арганізацый на акупіраванай тэрыторыі. Школа і культурна-асветніцкая справа ва ўмовах нямецкай акупацыі ў 1915–1916 гг. Беларускі народны камітэт і Цэнтральны саюз беларускіх нацыянальных грамадскіх арганізацый. Стварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай групы. Канфедэрацыя Вялікага Княства Літоўскага.

**Беларусь у час Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.** Перамога рэвалюцыі ў Петраградзе. Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі ў Беларусі і на Заходнім фронце. Звяржэнне самадзяржаўя. Стварэнне органаў Часовага ўрада, Саветаў, салдацкіх камітэтаў у Беларусі і на Заходнім фронце і іх дзейнасць. Асаблівасці грамадска-палітычнага становішча ў Беларусі. Палітычная дыферэнцыяцыя грамадства. Пазіцыі беларускіх і агульнарасійскіх партый па галоўных пытаннях палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця краіны. Рабочы рух,

арганізацыя прафесійных саюзаў. Дзейнасць фабрычна-заводскіх камітэтаў. Дэмакратызацыя арміі на Заходнім фронце. I з'езд ваенных і рабочых дэпутатаў арміі і тылу Заходняга фронту. Абуджэнне вёскі. З'езды сялянскіх дэпутатаў. Наступленне на франтах і яго вынікі. Канец двоеўладдзя.

**Беларускі нацыянальны рух у перыяд ад лютага да кастрычніка 1917 г.** Аднаўленне дзейнасці БСГ у гарадах Беларусі і Расіі, у арміі і на флоце, яе праграмныя ўстаноўкі. Канферэнцыя БСГ у чэрвені 1917 г. Утварэнне беларускіх нацыянальных партый і арганізацый: Беларускі саюз зямельных уласнікаў, Беларускі народны саюз, Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларуская партыя народных сацыялістаў, Беларускі саюз праваслаўнага духавенства, Беларуская партыя аўтанамістаў і інш. I з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый 25–27 сакавіка 1917 г., яго рашэнні. Стварэнне Беларускага нацыянальнага камітэта (БНК). Яго склад і дзейнасць. Адносіны Часовага ўрада да ідэі нацыянальна-дзяржаўнага вызначэння Беларусі. II з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый і партый 8–10 ліпеня 1917 г. і яго асноўныя рашэнні. Раскол у БНК. Стварэнне Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый (ЦРБА), яе дзейнасць. Размежаванне ў беларускім нацыянальным руху. Стварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. III з'езд БСГ. Прыняцце новай праграмы партыі. Рэарганізацыя ЦРБА і ўтварэнне Вялікай Беларускай Рады (ВБР). Пашырэнне беларускага нацыянальнага руху ў войску і заснаванне Цэнтральнай беларускай вайсковай рады (ЦБВР). Першыя спробы арганізацыі беларускіх вайсковых фарміраванняў. Беларускі абласны камітэт пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў (БАК), яго склад і ініцыятывы.

**Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце.** Абвастрэнне палітычнай сітуацыі. Барацьба супраць Карнілаўскага мецяжу. Бальшавізацыя Саветаў. Афармленне Паўночна-Заходняй абласной і франтавой арганізацый РСДРП(б). Грамадска-палітычнае становішча ў Беларусі ў кастрычніку 1917 г. Узброенае паўстанне ў Петраградзе. Стварэнне Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта (ВРК) Заходняй вобласці і фронту, яго склад і дзейнасць. Пераход улады да Саветаў і ваенкомаў у Беларусі і на Заходнім фронце. Усталяванне савецкай улады ў Мінску. «Камітэт выратавання рэвалюцыі», барацьба за ўладу. Усталяванне савецкай улады ў гарадах Беларусі, ліквідацыя органаў Часовага ўрада, Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве.

З'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняга фронту, III з'езд Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, II з'езд армій Заходняга фронту і іх рашэнні. Утварэнне і дзейнасць Абласнога Выканаўчага камітэта Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах) і СНК Заходняй вобласці. Дзейнасць Паўночна-

Заходняга абласного камітэта бальшавіцкай партыі. Першыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні савецкай улады. Палітыка ў галіне адукацыі і культуры. Дэкрэт аб міры і «Асноўны закон аб сацыялізацыі зямлі». Іх ажыццяўленне на Заходнім фронце і ў Беларусі.

Стаўленне беларускіх нацыянальных партый да савецкай улады. Два напрамкі ў беларускім нацыянальным руху. «Грамата да беларускага народа» Вялікай Беларускай Рады. Падрыхтоўка і скліканне І Усебеларускага з'езда ў снежні 1917 г. Рашэнні І Усебеларускага з'езда і яго разгон. Утварэнне Выканкома Савета Усебеларускага з'езда.

**Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.** Мяцеж польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага. Наступленне войскаў кайзераўскай Германіі ў лютым 1918 г. і захоп новых тэрыторый Беларусі. Падпісанне Брэсцкага мірнага дагавора 3 сакавіка 1918 г. і яго наступствы для Беларусі. Нямецкі акупацыйны рэжым на захопленай тэрыторыі Беларусі. Падпольная і партызанская барацьба супраць нямецкіх акупантаў. Беларускі нацыянальны рух пасля разгону І Усебеларускага кангрэса. Спробы стварэння беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах нямецкай акупацыі. Першая і другая Устаўныя граматы. Стварэнне Народнага сакратарыята. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Стварэнне Рады БНР і яе склад. Прыняцце трэцяй Устаўной граматы.

Узаемаадносіны Рады і ўрада БНР з германскімі акупацыйнымі ўладамі. Палітычны крызіс Народнага сакратарыята і Рады БНР вясной – летам 1918 г. Раскол БСГ. Дабавачны дагавор 27 жніўня 1918 г. Заканчэнне Першай сусветнай вайны і ануліраванне Брэсцкага дагавора. Адыход нямецкіх акупацыйных войскаў і ўступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыю Беларусі. Аднаўленне савецкай улады.

Барацьба кіраўніцтва БНР за міжнароднае прызнанне. Беларускае пытанне на Парыжскай мірнай канферэнцыі. Месца БНР у гісторыі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва беларускага народа.

**Утварэнне ССРБ і Літоўска-Беларускай ССР.** Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам) пры Наркамаце па справах нацыянальнасцяў РСФСР і беларускія секцыі РКП(б), іх намаганні і роля ў абвяшчэнні Беларускай савецкай рэспублікі. Адносіны Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б) і Аблвыкамзаха да праблемы стварэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Барацьба па пытанні аб беларускай савецкай дзяржаўнасці.

Прыняцце цэнтральнымі партыйнымі органамі рашэння аб утварэнні ССРБ. VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б). Стварэнне КП(б)Б. Фарміраванне Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларускай ССР. Маніфест аб абвяшчэнні Беларускай ССР.

Пастанова ЦК РКП(б) ад 16 студзеня 1919 г. аб вылучэнні са складу БССР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў. І Усебеларускі з'езд Саветаў і

яго рашэнні. Першая Канстытуцыя Савецкай Беларусі. Сумеснае пасяджэнне ЦВК БССР і ЦВК ЛітССР 27 лютага 1919 г., абранне ЦВК і СНК Літоўска-Беларускай ССР (Літбел), іх дзейнасць па арганізацыі абароны рэспублікі і ажыццяўленні мерапрыемстваў у сферы палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця. Ліквідацыя Літбела і яе прычыны.

**Беларусь у перыяд польска-савецкай вайны.** Прычыны польска-савецкай вайны. Палітыка польскіх улад у адносінах да беларускага пытання і Рады БНР. Федэралісцкая канцэпцыя Ю. Пілсудскага і канцэпцыя інкарпарацыі польскіх нацыянал-дэмакратаў. Віленская адозва Ю. Пілсудскага. Наступленне польскіх войскаў і ваенныя дзеянні на польска-савецкім фронце, захоп беларускай тэрыторыі. Дэкрэт УЦВК «Аб аб'яднанні Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік: Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Беларусі для барацьбы з сусветным імперыялізмам» ад 1 чэрвеня 1919 г. Выхад польскіх легіёнаў да Бярэзіны і Заходняй Дзвіны. Усталяванне польскага акупацыйнага рэжыму. Падпольны і партызанскі рух супраць польскіх акупантаў. Пазіцыя партыі беларускіх эсэраў. Курс на супрацоўніцтва з падпольнымі камуністычнымі структурамі. Ідэя «трэцяга шляху» ў рэвалюцыі. Стварэнне арганізацыі «Маладая Беларусь» і Беларускай камуністычнай арганізацыі. У. Ігнатоўскі.

Раскол у беларускім грамадска-палітычным руху. Сесія Рады БНР у снежні 1919 г. Утварэнне Найвышэйшай Рады БНР. Наступленне Чырвонай Арміі летам 1920 г. Аднаўленне савецкай улады на вызваленай ад польскай акупацыі тэрыторыі. Дагавор РСФСР і Літвы 12 ліпеня 1920 г. і яго наступствы для Беларусі. Палітычная барацьба па пытаннях адраджэння беларускай нацыянальнай дзяржавы на савецкай аснове. Другое абвяшчэнне БССР. Паражэнне Чырвонай Арміі пад Варшавай. Перагаворы паміж РСФСР і Польшчай аб перамір'і. Пытанне аб удзеле ў іх прадстаўнікоў Беларусі. Заканчэнне польска-савецкай вайны. Падпісанне прэлімінарнага мірнага дагавора Польшчы з РСФСР і Украінай. Стварэнне на польскай тэрыторыі антысавецкіх узброеных фарміраванняў. Разгром атрадаў С. Булак-Балаховіча, іншых антысавецкіх выступленняў. Слуцкі збройны чын у лістападзе – снежні 1920 г. II Усебеларускі з'езд Саветаў. Падпісанне Рыжскага мірнага дагавора, яго вынікі і наступствы для Беларусі.

## Тэма 12. Беларуская ССР у 20–30-я гг. XX ст.

Агляд літаратуры і гістарычных крыніц.

**Грамадска-палітычнае жыццё і нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва Беларусі ў 20-я гг. XX ст.** Грамадска-алітычнае, тэрытарыяльна-адміністрацыйнае і эканамічнае становішча БССР пасля Рыжскага міру. Адмоўны ўплыў на эканоміку краіны палітыкі «ваеннага камунізму». Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці. Актывізацыя ўзброенай антысавецкай

барацьбы ў пачатку 20-х гг. Стварэнне надзвычайных органаў, ўзмацненне барацьбы з антысавецкай дзейнасцю і бандытызмам. Стварэнне Беларускай праваслаўнай мітраполіі.

Палітычная амністыя 1923 г. у БССР. Вяртанне ў БССР дзеячаў БНР.

Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР у 1921–1927 гг. Пагадненні БССР з РСФСР і іншымі савецкімі рэспублікамі. Роля БССР у стварэнні Саюза ССР. IV з'езд Саветаў Беларусі і яго рашэнні. I Усесаюзны з'езд Саветаў 30 снежня 1922 г. Дэкларацыя і дагавор аб утварэнні Саюза ССР. Статус БССР у складзе СССР. Канстытуцыя СССР 1924 г.

Нацыянальная палітыка РКП(б) і КП(б) Беларусі. Рашэнні X і XII з'ездаў РКП(б) аб нацыянальнай палітыцы. Палітыка беларусізацыі, яе прычыны, сутнасць, умовы і характар ажыццяўлення. Вынікі беларусізацыі. Прычыны яе згортвання.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа ў БССР. Узбуйненне БССР у 1924 і 1926 гг. VII Надзвычайны з'езд Саветаў Беларусі. Становішча нацыянальных меншасцей у БССР. Нацыянальныя раёны і Саветы ў Беларусі.

Актывізацыя дзейнасці Саветаў. Усталяванне аднапартыйнай сістэмы. Самароспуск партыі беларускіх эсэраў. Прыняцце Канстытуцыі БССР 1927 г. Грамадскія арганізацыі. Прафсаюзы. Дзейнасць Рабоча-Сялянскай Інспекцыі.

**Пераход да новай эканамічнай палітыкі (НЭПа). Сельская гаспадарка.** Становішча беларускай вёскі і сельскай гаспадаркі ў пачатку 1920-х гг. Аграрная палітыка Камуністычнай партыі. X з'езд РКП(б). Пераход да НЭПа на вёсцы. Замена харчразвёрсткі харчовым падаткам. Дэкрэт ЦВК БССР «Аб свабодным выбары форм землекарыстання» (студзень 1922 г.). Землеўпарадкаванне, яго асаблівасці ў Беларусі. Рост хутарской сістэмы гаспадарання. Змены ў сацыяльнай структуры беларускай вёскі. Працэс драблення сялянскіх гаспадарак.

Кааператыўны рух у вёсцы, яго формы і дынаміка. Калектыўныя гаспадаркі і саўгаснае будаўніцтва. Вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі ў канцы 1920-х гг. Беларуская вёска напярэдадні «вялікага пералому». Д. З. Прышчэпаў.

**Прамысловае развіццё Беларусі ў 1920-я гг.** Прамысловасць Беларусі ва ўмовах пераходу да мірных умоў развіцця. Ажыццяўленне мерапрыемстваў новай эканамічнай палітыкі ў прамысловасці: развіццё рыначных адносін, увядзенне гаспадарчага разліку, рэарганізацыя кіравання народнай гаспадаркай, змена адносін да прыватнага капіталу. Грашовая рэформа і яе вынікі. Развіццё крэдыту. Галоўныя вынікі аднаўленчага перыяду ў прамысловасці. Рост прадукцыйнасці працы. Паляпшэнне сацыяльных умоў жыцця рабочых.

Згортванне дзейнасці прыватных прадпрыемстваў. Крызіс збыту, таварны голад. Паступовае згортванне НЭПу і пераход да адміністрацыйна-камандных метадаў кіравання эканомікай.

**Станаўленне беларускай савецкай культуры (1920-я гг.).** Палітыка па пытаннях развіцця нацыянальных культур. Асноўныя напрамкі, супярэчнасці і здабыткі. Развіццё беларускай культуры. Узмацненне ідэалагічнага ўціску ў культурным жыцці.

Фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі. Барацьба з непісьменнасцю. Станаўленне агульнаадукацыйнай, спецыяльнай і вышэйшай школ. БДУ. Навуковыя ўстановы. Дзейнасць Інстытута беларускай культуры. Стварэнне Акадэміі навук Беларусі. Матэрыяльна-тэхнічная база і кадравае забеспячэнне школы і навукі. Культурна-асветніцкая работа ў рэспубліцы.

Развіццё мастацкай літаратуры, тэатра ва ўмовах савецкай улады. Ідэйная барацьба ў творчай дзейнасці. Стварэнне і дзейнасць літаб'яднанняў. Музычнае і выяўленчае мастацтва.

**Беларуская эміграцыя ў 1920-я гг.** Палітычныя і эканамічныя прычыны эміграцыі з Беларусі. Цэнтры беларускіх палітычных партый і арганізацый у эміграцыі. Дзейнасць Рады і ўрада БНР. Палітычныя канферэнцыі ў Рызе і Празе. Адносіны лідэраў беларускай палітычнай эміграцыі да Рыжскага мірнага дагавора, да савецкай улады і БССР. Рост прасавецкіх настрояў у палітэміграцыі. Раскол беларускай эміграцыі. Канферэнцыя ў Берліне ў кастрычніку 1925 г. Вяртанне палітычных эмігрантаў у БССР і ўдзел іх у грамадскім жыцці.

**Індустрыялізацыя ў Беларускай ССР.** Пераход да фарсіраванай індустрыялізацыі краіны, яе прычыны і ўмовы. Унутрыпартыйная барацьба аб шляхах і метадах пабудовы сацыялізму. Першы пяцігадовы план развіцця эканомікі і культуры: яго асноўныя паказчыкі і асаблівасці ў прамысловасці Беларусі. Рэсурсы і сродкі развіцця індустрыялізацыі рэспублікі. Стварэнне новых галін прамысловасці. Новабудоўлі фабрык і заводаў, тэхнічная рэканструкцыя прадпрыемстваў ў гады першай пяцігодкі. Узмацненне камандна-адміністрацыйных метадаў кіравання прамысловасцю і выкананне планавых заданняў пяцігодкі. Вынікі першага пяцігадовага плана ў прамысловасці БССР.

Развіццё прамысловасці рэспублікі ў гады другой пяцігодкі. Планавыя паказчыкі і іх выкананне. Рост колькасці рабочага класа. Падрыхтоўка кадраў. Разгортванне працоўнага «сацыялістычнага спаборніцтва». Стаханаўскі рух. Метады дасягнення планавых паказчыкаў.

Вынікі індустрыялізацыі ў БССР.

**Калектывізацыя сельскай гаспадаркі рэспублікі.** Курс на сацыялістычную перабудову вёскі. Унутрыпартыйная барацьба па пытаннях аб шляхах развіцця

сельскай гаспадаркі. Крызіс хлебанарыхтовак. Забарона гандлю сельскагаспадарчымі прадуктамі.

Пераход да масавай калектывізацыі. Метады стварэння калектыўных гаспадарак. Ажыццяўленне «палітыкі раскулачвання». Выхад сялянскіх гаспадарак з калгасаў вясной 1930 г. Новы этап калектывізацыі восенню 1930 г. Рабочыя-дваццаціпяцітысячнікі. Арганізацыя МТС, палітаддзелаў пры іх. Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў і іх матэрыяльна-тэхнічнай базы. Саўгасы і іх гаспадарчая дзейнасць. Голад 1932–1933 гг. у Беларусі. Завяршэнне калектывізацыі беларускай вёскі, яе палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя вынікі.

**Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё Беларускай ССР у 1930-я гг.** Карэнны паварот у грамадска-палітычным і культурным жыцці ў пачатку 1930-х гг. Разгортванне ідэйна-палітычнай барацьбы з беларускім «нацыянал-дэмакратызмам». Характэрныя рысы савецкай грамадска-палітычнай сістэмы.

Палітыка «культурнай рэвалюцыі». Развіццё савецкай сістэмы адукацыі ў рэспубліцы. Барацьба за ліквідацыю непісьменнасці. Пераход да сямігадовага абавязковага навучання. Стварэнне сістэмы агульнаадукацыйнай, спецыяльнай і вышэйшай школ. Стварэнне сістэмы навуковых устаноў. АН БССР. У. Ігнатоўскі. Асноўныя накірункі развіцця беларускай навукі і дасягненні беларускіх вучоных у 1930-я гг.

Развіццё беларускай савецкай літаратуры. Асноўныя творы вядучых пісьменнікаў, паэтаў, драматургаў, крытыкаў і іх тэматыка. Абвастрэнне ідэйна-палітычнай барацьбы сярод беларускіх літаратараў. Перабудова пісьменніцкіх арганізацый. Стварэнне Саюза савецкіх пісьменнікаў.

Тэатральнае, музычнае, выяўленчае і іншыя формы мастацтва. Асноўныя накірункі іх развіцця ў рэспубліцы. Архітэктура Беларусі. Укараненне ў грамадстве «пралетарскай па змесце і сацыялістычнай па форме» культуры. Асноўныя рысы і характар грамадства, сфарміраванага ў Савецкім Саюзе ў канцы 1930-х гг.: палітычны, эканамічны, сацыяльны і духоўна-культурны аспекты.

**Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі ў 1930-я гг.** Аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны палітычных рэпрэсій. Разгортванне хвалі палітычных рэпрэсій у Беларусі ў пачатку 1930-х гг. Фабрыкацыя ДПУ БССР «контррэвалюцыйных» спраў. Палітыка ўлад у дачыненні да праваслаўнага і каталіцкага духавенства. Рэпрэсіі 1937–1938 гг. супраць інтэлігенцыі, партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва, ваенных і супрацоўнікаў НКУС БССР. Вынікі палітычных рэпрэсій.

## Тэма 13. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы (1921–1939)

Літаратура па тэме і агляд гістарычных крыніц.

**Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы.** Тэрыторыя Заходняй Беларусі, яе адміністрацыйны падзел. Віленскі канфлікт, яго прычыны. Сярэдняя Літва. Органы кіравання, сацыяльны, нацыянальны і канфесійны склад насельніцтва. Спецыфіка царкоўнага жыцця. Неаунія. Палітыка польскіх улад у Заходняй Беларусі. Нацыянальны прыгнёт. Закрыццё беларускіх школ. Прымусовая паланізацыя беларусаў.

Адметныя рысы эканомікі Заходняй Беларусі. Рэжым «санацыі». Прамысловасць і асноўныя яе галіны. Сусветны эканамічны крызіс 1929–1933 гг. і яго ўплыў на народную гаспадарку Заходняй Беларусі. Становішча рабочых. Умовы працы і жыцця. Рост беспрацоўя.

Сельская гаспадарка Заходняй Беларусі, яе стан і развіццё. Аграрная палітыка польскіх улад. Асадніцтва. Зямельныя рэформы і іх вынікі. Парцэляцыя, камасацыя, ліквідацыя сервітутаў. Землеўладанне. Падатковая палітыка. Збядненне вясковага насельніцтва, эканамічная эміграцыя.

**Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух.** Асноўныя палітычныя партыі і арганізацыі ў Заходняй Беларусі. Выбары ў польскі сейм 1922 г. Стварэнне і дзейнасць Беларускага пасольскага клуба. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Дзейнасць партыі беларускіх эсэраў. Утварэнне Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА). Партызанскі рух. Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (БСДП), Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), Беларускі сялянскі саюз (БСС). Дзейнасць польскіх, яўрэйскіх і іншых партый і арганізацый.

Утварэнне Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) і Камуністычнага Саюза моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ). Праграмныя мэты і задачы КПЗБ, яе дзейнасць.

Арганізацыя Беларускай сялянска-работніцкай Грамады (БСРГ), яе праграма і дзейнасць. Прычыны забароны БСРГ польскімі ўладамі і яе разгром.

Выбары ў сейм Польшчы ў 1928 г. у Заходняй Беларусі. Стварэнне Беларускага сялянска-рабочага пасольскага клуба «Змаганне». Уздым рабочага і сялянскага руху ў пачатку 1930-х гг. Касаўскае (1927) і Асташынскае (1932) выступленні сялян, Кобрынскае ўзброенае выступленне сялян (1933), выступленні нарачанскіх рыбакоў (1935). Узмацненне палітычных рэпрэсій польскіх улад. Спробы стварэння дэмакратычнага антыфашысцкага народнага фронту. Беларускае народнае аб’яднанне (БНА). Прычыны роспуску КПЗБ. Рэпрэсіі ў адносінах да яе кіраўнікоў і членаў.

**Культура Заходняй Беларусі.** Умовы развіцця культуры. Барацьба за асвету на роднай мове. Таварыства беларускай школы (ТБШ), Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК), Беларускае навуковае таварыства (БНТ). Літаратура, друк і мастацтва. Творы М. Васілька, В. Таўлая, М. Танка, І. Дварчаніна, Б. Тарашкевіча і інш. Я. Драздовіч, П. Сергіевіч, Р. Шырма. Народная творчасць.

## РАЗДЗЕЛ VI. БЕЛАРУСЬ З 1939 Г. ДА ПАЧАТКУ XXI СТ.

### Тэма 14. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны (1939–1945) і Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945)

Гістарыяграфія праблемы, агляд крыніц.

**Беларусь у пачатку Другой сусветнай вайны.** Заходняя Беларусь у геапалітычных планах Германіі і Савецкага Саюза. Германа-савецкі дагавор аб ненападзе 23 жніўня 1939 г., сакрэтныя пратаколы да яго. Пачатак Другой сусветнай вайны. Ваенныя дзеянні германскіх войскаў на беларускай тэрыторыі. Бежанства.

Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Ваенныя сутыкненні польскай арміі і савецкіх войскаў.

Арганізацыя часовых органаў кіравання, іх дзейнасць. Перадача Вільні і Віленшчыны Літве. Народны сход Заходняй Беларусі і яго рашэнні. Прыняцце Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз’яднанне яе з БССР. Станаўленне савецкай улады ў Заходняй Беларусі, яе асаблівасці. Выбары ў Вярхоўныя Саветы СССР і БССР.

Сацыяльна-эканамічныя, і культурныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях БССР. Пачатак стварэння калгасаў і МТС. Асаблівасці развіцця прамысловасці. Змены ў культурным жыцці. Дэпартацыі з заходніх раёнаў БССР асаднікаў, служачых лясной аховы і інш.

Значэнне ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР.

**Вынікі развіцця БССР у канцы 30-х – пачатку 40-х гг. XX ст.** Трэці пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі. Асноўныя накірункі і вынікі развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў 1938–1941 гг. Узмацненне працоўнай дысцыпліны. Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё рэспублікі напярэдадні вайны. Новы адміністрацыйны падзел БССР. Удзел Беларусі ў мерапрыемствах па ўзмацненні абараназдольнасці СССР. Заходняя Асобая вайсковая акруга, пераўзбраенне яе войскаў. Стварэнне ўмацаваных раёнаў. Удзел беларускага насельніцтва ў абарончых мерапрыемствах.

**Беларусь на пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі летам 1941 г.** Напад фашысцкай Германіі на СССР. Прыгранічныя баі на тэрыторы

БССР. Абарона Брэсцкай крэпасці. Навагрудскі кацёл. Мерапрыемствы КП(б)Б і ўрада рэспублікі па мабілізацыі і эвакуацыі. Будаўніцтва абарончых аб'ектаў. Баі пад Мінскам, Барысавам, Бабруйскам і Віцебскам. Баі на Бярэзіне і Дняпры. Абарона Магілёва і Гомеля. Контрудары савецкіх войскаў. Атрады народнага апалчэння. Прычыны паражэння савецкіх войскаў у першы перыяд вайны. Значэнне абарончых баёў на тэрыторыі Беларусі.

**Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі.** Захоп тэрыторыі Беларусі германскімі войскамі. Устанаўленне акупацыйнага рэжыму, яго мэты. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі. Сістэма акупацыйнай улады і яе органаў. Рабаванне гітлераўцамі гаспадарчых і культурных каштоўнасцяў рэспублікі. Стварэнне канцлагераў. Яўрэйскія гета. Масавае знішчэнне ваеннапалонных і насельніцтва, угон яго на прымусовыя работы ў Германію. Карныя экспедыцыі. Калабаранцкія арганізацыі і іх дзейнасць. Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная царква. Каталіцкая царква і спробы актывізацыі місіянерства.

**Разгортванне ўсенароднай барацьбы супраць фашысцкіх захопнікаў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.** Стварэнне падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый і партызанскіх. Мінскае партыйнае падполле. Барацьба падпольных арганізацый з акупантамі ў Віцебску, Магілёве, Оршы і іншых гарадах і раёнах Беларусі. Асаблівасці антыфашысцкай барацьбы ў Заходняй Беларусі. Антыфашысцкія выступленні ў гета.

Узмацненне партызанскага руху пасля разгрому нямецка-фашысцкіх войскаў пад Масквой. Баявая дзейнасць партызан. Суражскія (Віцебскія) «вароты». Арганізацыйная структура савецкага партызанскага руху. Стварэнне Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР) і Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР).

Партызанскія зоны. Партызанскія рэйды. Узаемаадносіны партызан і мірнага насельніцтва. Супрацоўленне насельніцтва акупантам, зрыў іх палітычных і эканамічных мерапрыемстваў. «Рэйкавая вайна», яе этапы і значэнне.

Дзейнасць нацыянальных антыфашысцкіх фарміраванняў. Армія Краёва.

**Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.** Пачатак вызвалення Беларусі ў восенню 1943 – зімой 1944 гг. Аперацыя «Канцэрт». Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Сумесныя дзеянні партызан з часцямі Чырвонай Арміі. Акружэнне і разгром фашысцкіх войскаў пад Віцебскам, Бабруйскам, Мінскам. Вызваленне сталіцы Савецкай Беларусі. Парад савецкіх партызан. Брэсцка-Люблінская наступальная аперацыя. Завяршэнне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Пачатак аднаўлення народнай гаспадаркі, установу адукацыі і культуры на вызваленай тэрыторыі, актыўная дапамога ў гэтым народаў Савецкага Саюза.

Перамога над фашысцкай Германіяй. Завяршэнне Вялікай Айчыннай вайны і Другой сусветнай вайны. Уклад беларускага народа ў разгром фашысцкай Германіі і мілітарысцкай Японіі. Праца эвакуіраванага насельніцтва Беларусі ў савецкім тыле. Удзел беларусаў у еўрапейскім руху Супраціўлення. Людскія, матэрыяльныя і культурныя страты Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны.

## Тэма 15. Беларусь у пасляваенны перыяд (другая палова 40-х – першая палова 50-х гг. ХХ ст.)

Агляд айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Класіфікацыя крыніц, характарыстыка іх асноўных груп.

**Пераход да мірнага будаўніцтва. Развіццё прамысловасці.** Страты, нанесеныя фашысцкімі акупантамі народнай гаспадарцы і культуры Беларусі. Аднаўленчыя работы ў гады чацвёртай пяцігодкі (1946–1950 гг.). Дапамога народаў СССР Беларусі. Аднаўленне і рэканструкцыя прамысловых прадпрыемстваў, энергетычнай і паліўнай базы, чыгункі. Узнаўленне гарадоў. Пасляваенная індустрыялізацыя Беларусі, яе сутнасць і вынікі. Стварэнне новых галін прамысловасці. Прамысловае развіццё заходніх абласцей БССР. Рост рабочага класа і яго працоўнае падзвіжніцтва. Роля жанчын і падлеткаў у аднаўленчых работах.

Аднаўленне і развіццё сельскай гаспадаркі. Становішча сельскай гаспадаркі пасля вызвалення рэспублікі. Цяжкасці яе аднаўлення. Калектывізацыя ў заходніх абласцях БССР і яе вынікі. Ліквідацыя хутароў. Узбуйненне калгасаў. Сістэма кіравання калгасамі. Дзяржнарыхтоўкі. Скарачэнне прысядзібных гаспадарак. Прычыны адставання сельскай гаспадаркі ад тэмпаў адраджэння прамысловасці і транспарту і метады іх пераадольвання.

**Матэрыяльнае становішча насельніцтва. Культура, навука і адукацыя.** Бытавое становішча насельніцтва рэспублікі. Картачная сістэма. Заработная плата рабочых і служачых. Зніжэнне жыццёвага ўзроўню жыхароў Беларусі ў сувязі з засухай 1946 г. у Украіне. Працадзень і яго аплата. Падатковая палітыка ў вёсцы. Прымусовыя пазыкі. Жыллёвае будаўніцтва. Адмена картачнай сістэмы і правядзенне грашовай рэформы. Зніжэнні цэн. Наладжванне медыцынскага і сацыяльнага забеспячэння. Уладкаванне дзяцей-сірот. Радыёфікацыя вёскі. Рэпатрыяцыя.

Аднаўленне і развіццё агульнаадукацыйнай, сярэдняй спецыяльнай школы, вышэйшых навучальных устаноў, бібліятэк, клубаў. Падрыхтоўка навукова-педагагічных кадраў. Аднаўленне і пашырэнне дзейнасці навуковых устаноў. Змена прыярытэтаў навуковых даследаванняў. Развіццё беларускай літаратуры. Творчасць Я. Коласа, І. Шамякіна, І. Мележа, П. Пестрака, Я. Брыля, К.

Крапівы, М. Танка і інш. Дзейнасць тэатральных калектываў. Развіццё музычнага мастацтва. Творчасць М. Аладава, А. Багатырова, У. Алоўнікава, Ю.Семянякі і інш. Выяўленчае мастацтва. Тэматыка твораў мастакоў І. Ахрэмчыка, Я. Зайцава, У. Сухаверхава і інш. Гераічная тэматыка скульптараў З. Азгура, А. Бембеля, А. Глебава і інш. Архітэктура і горадабудаўніцтва. Кінамастацтва.

**Грамадска-палітычнае жыццё.** Асноўныя тэндэнцыі развіцця савецкага грамадства. Надзеі на дэмакратызацыю грамадскага жыцця. Умацаванне адміністрацыйна-каманднай сістэмы. Формы і метады дзейнасці партыйных, савецкіх, камсамольскіх, прафсаюзных і грамадскіх арганізацый, іх роля ў жыцці рэспублікі. П. К. Панамарэнка. М. І. Гусараў. М. С. Патолічаў. Грамадска-палітычная праца ў заходніх абласцях рэспублікі. Стварэнне і дзейнасць палітаддзелаў у заходніх абласцях.

